# artykuły

**Аляксандр Краўцэвіч**
(Гродна)

## Да праблемы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага

Па гісторыі Вялікага княства Літоўскага створана надзвычай аб'ёмная гістарыяграфія, частка якой прысвечана працэсу пачатковага дзяржаваўтварэння. За час існавання Савецкага Саюза сфармаваўся адзіны погляд на гэту праблему (угрунтаваны на рускай дасавецкай і польскай міжваеннай гістарыяграфіі), які не прадугледжваў існавання іншых. Толькі незадоўга да афіцыйнага зліквідавання СССР у Беларусі пабачылі свет працы М. Ермаловіча, у якіх выкладаецца альтэрнатыўная версія.

Тым не менш праблему нельга лічыць вырашанай. Магчымасць іншых поглядаў на генезіс Вялікага княства мы бачым у новых метадалагічных падыходах і выкарыстанні новых эмпірычных даных, сабраных археолагамі за апошнія тры дзесяцігоддзі.

Цікавай і перспектыўнай уяўляецца спроба сістэмнага падыходу за прыкладам Л. М. Гумілёва[1]. Яна грунтуецца на прыняцці наступнай тэзы: дзяржаўная сістэма, якая атрымала назоў Вялікае княства Літоўскае, прыйшла на змену іншай сістэме, існаваўшай да яе на той жа тэрыторыі.

Геаграфічна працэс дзяржаваўтварэння даследчыкі амаль аднагалосна прывязваюць да басейна Нёмана, а храналагічна — да 13 ст. У гэты час на Панямонні праходзілі актыўныя міжэтнічныя працэсы, сутнасцю якіх было пранікненне ўсходніх славян на землі, заня-

[1] Л. Н. Гумилев, *Конец и вновь начало*, Москва 1994, с. 58-60.

тыя балтамі і асіміляцыя апошніх. Усходнія славяне з’явіліся на Панямонні яшчэ ў 6—7 стст.[2], але асабліва актывізаваўся гэты працэс з канца 10 ст. Менавіта ў гэты час славянамі былі заснаваны асноўныя панямонскія гарады: Гародня, Наваградак, Ваўкавыск. Адной з магчымых прычын, якія выклікалі гэту хвалю каланізацыі была гвалтоўная хрысціянізацыя ўсходніх славян якраз у канцы 10 ст. Імкненне з дапамогай жорсткіх мер змяніць развіты і складаны светапогляд познародавага грамадства магло прымусіць частку насельніцтва да адтоку ва ўжо разведаную вобласць — Панямонне. І прыйшлі сюды ў першую чаргу людзі з суседніх тэрыторый, даўно асвоеных усходнімі славянамі. Да пачаткаў Вялікага княства заставалася яшчэ больш двух стагоддзяў. І ўвесь гэты час актыўна працягваўся працэс усходнеславянскай каланізацыі Панямоння. Да 13 ст. у рэгіёне стварылася дынамічная раўнавага палітычных сілаў, раўнавага паміж невялікімі напаўзалежнымі ад Кіева ўсходнеславянскімі дзяржавамі — княствамі і мясцовымі балцкімі плямёнамі. Гэты сімбіёз у сваю чаргу быў часткай велізарнай палітычнай сістэмы Усходняй Еўропы. Раўнавагу не змагла парушыць успышка ваяўнічасці балцкіх плямён у другой палове 12 ст., якія ў летапісах названы „літоўцамі”. Яны рэзка актывізавалі сваю ваеннарабаўнічую дзейнасць. Відавочна, такая актыўнасць была выклікана ўступленнем летапісных літоўцаў у стадыю познародавага грамадства — перыяд так званай „ваеннай дэмакратыі”, калі вайна „вядзецца цяпер толькі дзеля рабаўніцтва, становіцца пастаянным промыслам”[3]. Літоўцам было што рабаваць — археалагічныя матэрыялы сведчаць аб росквіце матэрыяльнай культуры ў суседніх славянскіх феадальных дзяжравах. Літоўцы рэгулярна ходзяць з нападамі на ўсіх суседзяў за выключэннем Беларускага Панямоння.

Менавіта з гэтай успышкай ваяўнічасці звычайна звязваецца пачатак Вялікага княства Літоўскага, у тым сэнсе, што раздробленая аслабелая Русь не магла аказваць супраціў літоўцам, тыя пачалі яе патроху заваёўваць і такім чынам пашыраць сваю дзяржаву. Аднак гэтыя напады, на наш погляд, не былі настолькі магутным фактарам, каб разбурыць або сур’ёзна парушыць сістэму. Іх уплыў на жыццё тагачаснай Русі можна параўнаць з уплывам печанегаў ці полаўцаў. Спецыяльныя даследаванні паказваюць, што ў пазнейшыя часы, пасля так званай заваёвы, працэс прасоўвання славян

[2] Я. Г. Зверуго, *Верхнее Понеманье в IX—XIII вв.*, Мінск 1989, с, 14.

[3] Ф. Энгельс, *Происхождение семьи, частной собственности и государства,* [в:] К. Маркс, Ф. Энгельс, *Избранные сочинения. В 9-ти томах*, т. 6, Москва 1987, с. 230.

у балцкія землі не спыняецца, гэтаксама як і асіміляцыя мясцовых балтаў[4].

Палітычная сістэма Усходняй Еўропы аказалася разбуранай у сярэдзіне 13 ст. падзеямі надзвычайнага маштабу і важнасці. Уся паўднёвая і ўсходняя частка ўсходнеславянскага арэалу была зруйнавана мангола-татарамі. Татарская навала знішчыла мясцовыя дзяржавы, перасекла традыцыйныя гандлёвыя шляхі. Пагроза з поўдня адчувалася і на Панямонні. Акрамя таго знешняя небяспека пагражала з поўначы і з захаду: ордэн мечаносцаў з пачатку стагоддзя ўсталёўваўся ў ніжнім цячэнні Дзвіны, Тэўтонскі ордэн, заваяваўшы Прусію, з 1283 г. распачаў актыўную агрэсію на Панямонне. Ва Усходняй Еўропе распачаліся новыя працэсы, напрыклад, кароткачасовае ўзвышэнне Галіцка-Валынскага княства, якое ў сярэдзіне 13 ст. стала мацнейшай дзяржавай у рэгіёне і заняпала зноў жа пад націскам мангола-татараў.

Адпаведна другому пачатку тэрмадынамікі (закон энтрапіі) сістэма атрымоўвае першасны штуршок — імпульс і потым растрачвае атрыманую энергію на пераадоленне супраціву знешняга асяроддзя, пакуль зноў не прыйдзе да раўнавагі. Відавочна, дапусціўшы дзейнасць гэтага закону ў нашым выпадку, правамерна паставіць пытанне: што было першасным штуршком тут на Панямонні? Якім чынам была прыведзена ў рух мясцовая этна-сацыяльна-палітычная сістэма? Як мы ўжо казалі раней, існуюць дзве версіі гэтага штуршка. Першая, найбольш распаўсюджаная па свеце — яе можна ўмоўна назваць „літоўскай”, ці „летувіскай” (яна ж афіцыйная савецкая). Яна сцвярджае, што спачатку ўтварылася раннелітоўская дзяржава, якая сфармавалася незалежна (ці амаль незалежна) ад славянскіх суседзяў, на тэрыторыі, населенай балцкімі плямёнамі і меўшай назоў „Літва”. Сама гэтая тэрыторыя атаясамляецца ў агульных абрысах з басейнам ракі Віліі па яе сярэдняму цячэнню, дзе з 4 па 13 ст. існавала культура ўсходнелітоўскіх курганоў[5]. Апошняя ў сваю чаргу вырасла з часткі культуры штрыхаванай керамікі (датуецца І-й паловай І-га тыс. н.э.). Такім чынам перад намі жорстка звязана ў часе і прасторы схема „вырастання” літоўскай дзяржаўнасці яшчэ з жалезнага веку. Часам летувіскія даследчыкі прызнаюць уплыў на гэты працэс існуючых побач дзяржаўных утварэнняў усходніх славян[6]. І толькі пасля з’яўлення гэ-

4 J. Ochmański, *Pogranicze litewsko-krywickie w epoce plemiennej*, [w:] „Przegląd Historyczny”, 1970, t. LXI, z. 2, s. 183-191.

5 Р. К. Волкайте-Куликаускиене, *Образование литовской народности (по данным археологии)*, „Советская этнография”, Москва 1979, н-р 3, с. 31-46.

6 Р. К. Волкайте-Куликаускиене, там жа, с. 41.

тай дзяржавы пачынаецца ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага шляхам заваёвы ўсходнеславянскіх зямель. Такі погляд у асноўных рысах падзяляе беларускі даследчык В. Л. Насевіч, які лічыць, што заваёва пачалася на стадыі ўтварэння літоўскай „цэнтралізаванай раннекласавай дзяржавы”[7]. На гэтай схеме базуецца ўся ідэалогія навукі аб Вялікім княстве Літоўскім, якая распрацоўваецца ў Летуве і не толькі там.

Аднак узнікаюць пытанні. Што гэта за ранняя літоўская дзяржава, аб якой нічога не вядома? Дзе была яе сталіца? Якая сістэма адміністрацыйнага падзелу, сістэма кіравання, права, падаткаабкладання? Адказу на гэтыя пытанні мы не знойдзем ні ў Г. Пашкевіча[8], ні ў Г. Лаўмяньскага[9], ні ў У. Пашуты[10], ні ў саміх летувісаў. У асноўным яны аперуюць аналагамі з ладам насельнікаў Прусіі, апісаным нямецкімі храністамі 14 ст. Але і ў прусаў не было дзяржаўнасці. На момант прыходу крыжакоў у 1230 г. яны знаходзіліся толькі на стадыі яе ўтварэння[11]. У першыя дзесяцігоддзі 13 ст. Генрых Латвійскі тытулуе князя палачан каралём, а балтаў называе проста „літоўцы”, „куры” і г.д.[12] Паводле Г. Лаўмяньскага старэйшыя літоўскія князі, названыя ў вядомай дамове 1219 г. з галіцкавалынскімі князямі, не могуць лічыцца манархамі ці кіраўнікамі зямель, а проста былі самымі моцнымі правадырамі дружын[13].

Другая версія пачатковага штуршка — канцэпцыя ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, прапанаваная М. Ермаловічам: горад Наваградак запрасіў на свой стол літоўскага князя — перабежчыка Міндоўга[14] (у апошняй працы даследчык гаворыць аб паходжанні Міндоўга з роду полацкіх князёў[15]). Той, атрымаўшы грошы і войска, заваяваў Літву — востраў балцкага насельніцтва ў беларускім абшары — падпарадкаваўшы яе сабе, гэта значыць Наваградку. Вялікае княства Літоўскае з самых пачаткаў было беларускай дзяржавай.

[7] В. Л. Насевіч, *Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы*, Мінск 1993, с. 75, 78.

[8] H. Paszkiewicz, *Jagiellonowie a Moskwa*, t. 1. *Litwa a Moskwa w XIII i XIV wieku*, Warszawa 1933.

[9] H. Łowmiański, *Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego*, Poznań 1983.

[10] В. Т. Пашуто, *Образование Литовского государства*, Москва 1959.

[11] В. И. Кулаков, *Земля пруссов и „прусские земли”*, [в:] *Балто-славянские исследования 1985 г.*, Москва 1987, с. 95-101.

[12] Генрих Латвийский, *Хроника Ливонии*, Москва—Ленинград 1938.

[13] H. Łowmiański, *Studia...*, s. 315.

[14] М. І. Ермаловіч, *Па слядах аднаго міфа*, Мінск 1991, с. 58; ён жа: *Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды*, Мінск 1990, с. 315-318.

[15] М. І. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд*, Мінск 1994, с. 8.

Нягледзячы на выразную супярэчлівасць, гэтыя дзве версіі маюць агульныя рысы. Па-першае, яны ўкладваюцца ў тэзу аб „пачатковым штуршку”. Па-другое, у іх назіраецца блізкая храналагічная (13 ст.) і тэрытарыяльная (басейн Нёмана) лакалізацыя працэсаў дзяржаваўтварэння. Па-трэцяе, пачатак дзяржаваўтварэння звязваецца з адной і той жа гістарычнай асобай — Міндоўгам (толькі Г. Пашкевіч лічыў Міндоўга аднавіцелем адзінства дзяржавы, якая склалася ўжо ў пач. 13 ст.). Па-чацвёртае, абедзьве канцэпцыі маюць выразную ідэалагічную афарбоўку, якая відна ў імкненні даказаць канкрэтную этнічную прыналежнасць дзяржавы (летувіскую ці беларускую) з самага яе пачатку.

Ці ўвогуле магчыма вырашыць пытанне аб этнічным прыярытэце ў працэсе дзяржаваўтварэння на Панямонні пры сучасным узроўні навукі? Відавочна, пакуль што не. Варта адзначыць, што сёння гэтая праблема набыла важнае ідэалагічнае значэнне ў сувязі з працэсам пабудовы незалежных дзяржаў народамі — спадкаемцамі Вялікага княства Літоўскага. Але з пункту гледжання акадэмічнай навукі гэта такая ж важная праблема, як і ўсе астатнія.

Сутнасць метадалагічнага падыходу, які мы прапаноўваем — разгляд дзяржаваўтварэння на фоне міжэтнічных працэсаў на Панямонні ў канцы I-га — першых стагоддзях 2-га тыс. н.э. Адной з праяў гэтых працэсаў з’яўляецца перамяшчэнне этнічнай мяжы паміж балтамі і ўсходнімі славянамі (гл. карту н-р 3). Прынята лічыць, што мяжа паміж балцкімі і славянскімі плямёнамі ў сярэдзіне I-га тыс. н.э. праходзіла прыблізна на Прыпяці, а пачынаючы з 6-га (магчыма 7-га) ст. адсоўваецца на поўнач і паўночны захад[16]. На 9-10 стст. даследчыкі праводзяць яе прыблізна па лініі Заслаўе — Рубяжэвічы — Дзераўная — Беліца — Слонім — Ваўкавыск; у 12 ст. яна прасунулася яшчэ далей: Гродна — Ваўкавыск — Слонім — Навагрудак — Заслаўе — Лагойск[17]. Найбольш грунтоўна даследаваннем этнічнай мяжы паміж балтамі і ўсходнімі славянамі займаўся Е. Ахманьскі. Даследчык прыйшоў да высновы, што „належыць прызнаць за гістарычную рэальнасць факт пастаяннага адступлення літоўскага насельніцтва на захад, ці звужэння літоўскага моўнага абшару і расшырэнне абшару рускага”[18] (чытай „беларускага” — А. К.). Ежы Ахманьскі разглядае адносіны між балта-

16 Я. Г. Зверуго, *Славяне и балты в междуречье верхнего Днепра и среднего Немана*, [в:] *Проблемы этнической истории балтов. Тезисы докладов межреспубл. конф.*, Рига 1985, с. 67-69.

17 Я. Г. Зверуго, *Верхнее Понеманье...*, с. 15.

18 J. Ochmański, *Litewska granica etniczna na wschodzie od epoki plemiennej do XVI wieku*, Poznań 1981, s. 16.

мі (ён называе іх літоўцамі) і беларусамі (рускімі) з 7 па 13 ст. як змаганне за тэрыторыі і выдзяляе тры этапы гэтай барацьбы: 1. 7-9 стст. — сутыкненне літоўцаў і крывічоў; 2. 10— 12стст. — палітычная перавага Полацка; 3. 2-я палова 12 — сяр. 13 ст. — перамога Літвы. Такім чынам даследчык прыйшоў да высновы, што „барацьба Літвы з Руссю за палітычную мяжу, якая цягнулася больш за два стагоддзі, канчаткова закончылася каля сярэдзіны 13 ст. трыумфам Літвы. Паўстаўшая каля сярэдзіны 13 ст. літоўская дзяржава аб’яднала пад сваёй уладай усе этнічныя літоўскія землі і заняла таксама тэрыторыі, прылеглыя да карэннай Літвы, заселеныя русінамі. Літва вярталася ў свае старыя межы з-пад рускай экспансіі”[19]. Аднак сцвердзіўшы трыумф Літвы, Е. Ахманьскі далей канстатуе, што пазней пасля 16 ст. адбылося знікненне літоўскай мовы на „ашмянска-мінскім паграніччы” і ў іншых месцах[20]. Больш дэталёва гэтую з’яву даследчык не разглядае, відавочна таму, што яна ляжыць за храналагічнай мяжой яго даследавання. Тэза аб канфрантацыі ў літоўска-беларускіх адносінах супярэчыць высновам іншых даследчыкаў, якія звяртаюць увагу на мірны характар названых кантактаў (аб гэтым ніжэй).

Дзеля высвятлення праблемы этнічнай мяжы мы паспрабавалі скарыстаць вынікі археалагічных даследаванняў апошніх 30 гадоў і нанесці на карту Панямоння этнічна і храналагічна інтэрпрэтаваныя помнікі 2-й паловы I тыс. і 11—14 стст. (гл. карты 1—2). Трэба адзначыць, што і на сённяшні дзень помнікі археалогіі гэтага перыяду вывучаны слаба, этнічная прыналежнасць і датыроўка акрэслены толькі невялікай іх часткі (прыблізна 20 — 30%). Аднак для абагульненняў гэтага дастаткова. На карце н-р 2 добра ілюструецца выснова аб актыўным пранікненні на Панямонне ўсходніх славян, пачынаючы з канца 10 ст. На карце відаць, што славянскія і балцкія паселішчы і пахаванні размешчаны больш-менш кампактнымі „плямамі” і ўперамешку. На поўначы бліжэй да балцкага масіву больш балцкіх „плямаў”, на поўдні — славянскіх. Усе панямонскія гарады ўсходнеславянскія — беларускія.

Асобны від археалагічных помнікаў — каменныя магілы. Адны даследчыкі лічаць іх чыста балцкімі — яцвяжскімі[21], другія — „помнікамі старажытнарускага насельніцтва Чорнай Русі, насельніцтва, якое склалася ў выніку цеснага ўзаемадзеяння яцвягаў са славяна-

[19] Там жа, с. 24.
[20] Там жа, с. 80.
[21] А. В. Квятковская, *Каменные могильники Беларуси XI—XVII вв.*, Дисс. на соиск. уч. ст. канд. истор. наук, Мінск 1994, с. 194.

мі”[22]. Такім чынам можна вывесці, што ў 13 ст. міжэтнічныя працэсы на Панямонні былі ў самым разгары. Сутнасць іх не змянілася пасля стварэння Вялікага княства Літоўскага. Вынік вядомы. Аўтар гэтага артыкула нарадзіўся і вырас на Панямонні ў вёсцы, размешчанай у ніжнім цячэнні Шчары і ніколі не чуў ніводнага літоўскага слова і не сустрэў там ніводнага літоўца.

Відавочна, патрэбна адмовіцца ад пошукаў дакладнай мяжы паміж славянамі і балтамі на той час. Інакш кажучы, прапаноўваецца пашырыць гэтую мяжу. Даследчыкі: Г. Лаўмяньскі, Г. Пашкевіч, Е. Ахманьскі, Я. Звяруга, М. Грынблат і інш. імкнуліся правесці выразную мяжу з агаворкамі, што па абодва яе бакі застаюцца „астравы” насельніцтва: балтаў на славянскай і славян на балцкай тэрыторыі. Археалагічныя даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў даюць падставы дапускаць, што мяжой, калі тут будзе дарэчы гэты тэрмін, магла быць паласа шырынёй каля паўтары — двух сотняў кіламетраў, якая ўключала ў сябе Верхняе і Сярэдняе Панямонне і размяшчалася прыблізна паміж Мінскам і Вільняй. Дакладней яе можна назваць „кантактнай зонай”. Да высновы аб тым, што „паміж кампактнымі этнічнымі масівамі славян і балтаў мелася вялікай зона, у якой насельніцтва абодвух кантактуючых этнасаў жыло „церазпалосна” ці „бок да бока” прыйшоў Я. Г. Звяруга, які некалькі дзесяцігоддзяў даследуе старажытнасці Панямоння[23]. Усходнія славяне і балты жылі на адной тэрыторыі, перамешваліся дзе раўнамерна, дзе плямамі — скапленнямі *(мы пакуль не мелі магчымасці прааналізаваць матэрыялы летувіскіх археолагаў)*. Гарады: Гародня, Наваградак, Ваўкавыск, Слонім, Здзітаў, Астрэя, Турэйск, Вевярэск і інш. былі, несумненна, славянскімі, але абслугоўвалі ўвесь рэгіён са змешаным насельніцтвам. Працэс перамешвання і ўзаемапранікнення паміж рознаэтнічнымі насельнікамі выразна бачны на матэрыяльнай культуры. Я. Г. Звяруга лічыць міралюбівы характар міжэтнічных кантактаў „найбольш істотнай рысай гэтых узаемаадносін” і бачыць доказ таму ў захаванні балцкага гідранімічнага слоя на занятай славянамі тэрыторыі і паўсюднае распаўсюджванне славяна-балцкіх шлюбаў[24]. Незвычайны росквіт гарадскога жыцця ў Панямонні выкліканы, на наш погляд, у значнай ступені праз названае супрацоўніцтва. Нідзе ні ў адным летапісе не зафіксавана ніводнага выпадку нападу летапісных літоўцаў на гарады Панямоння. На ўсе суседнія землі хадзілі рабаваць, а сюды — не.

22 В. В. Седов, *Литовские племена*, [в:] *Финно-угры и балты в эпоху средневековья*, Москва 1987, с. 417.

23 Я. Г. Зверуго, *Верхнее Понеманье...*, с. 15; гл. таксама: J. Tyszkiewicz, *Proces slawizacji ziem dorzecza Niemna w VI–XI w.*, „Przegląd Historyczny”, 1973, t. LXIV, s. 1-23.

24 Там жа.

У сярэдзіне 13 ст. склаліся адпаведныя знешнія ўмовы, падштурхнуўшыя да пачатку стварэння мясцовай дзяржавы. Унутраным штуршком, парушыўшым дынамічную раўнавагу палітычных сіл, мог стаць саюз багатых панямонскіх гарадоў з ваяўнічымі правадырамі балцкіх плямёнаў. У гэтым рэчышчы плённай уяўляецца ідэя М. Ермаловіча аб запрашэнні Міндоўга на наваградскі стол. У той жа час спробы гэтага даследчыка лакалізаваць летапісную Літву выглядаюць непераканаўча ў святле археалагічных даследаванняў на Панямонні.

Выбар асобы Міндоўга невыпадковы, ён быў самым моцным ці адным з мацнейшых балцкіх князёў. Такі саюз, відавочна, парушыў раўнавагу сіл, даў перавагу саюзнікам і пры спрыяльных знешніх умовах мог стаць штуршком да пачатку працэсу дзяржаваўтварэння.

Лагічнай выглядае версія аб значнай ролі Наваградка ў гэтай справе. Адкрытае археолагамі багацце яго матэрыяльнай культуры, шырыня і размах гандлёвых сувязей уражваюць нават спецыялістаў. У прыватнасці недаўменне археолагаў выклікала адкрыццё цэлага квартала багатых рамеснікаў на вакольным горадзе. На думку Ф. Д. Гурэвіч — аўтара адкрыцця — яго ўзнікненне — вынік мясцовага развіцця[25]. Такой колькасці прафесійных рамеснікаў-ювеліраў патрабаваўся вялікі мясцовы рынак і, відавочна, яго забяспечвалі не толькі навакольныя славянскія паселішчы, але таксама і балцкія. Горад размешчаны ў выгодным стратэгічна месцы амаль у цэнтры кантактнай зоны. Факт каранацыі Міндоўга менавіта ў гэтым горадзе можна лічыць верагодным.

Далейшы ход працэсу — асобная тэма. Ён ішоў не проста і гладка, а з адступленнямі, паваротамі, паразамі, унутранай барацьбой за ўладу і толькі ў канцы 13 — пачатку 14 ст. пры Віцені і Гедыміне набыў незваротны характар.

Як будавалася дзяржава? Зразумела, па правераных узорах, якія былі ў наяўнасці, гэта значыць, на аснове ўсходнеславянскага вопыту. Раннелітоўская дзяржава па ўсёй верагоднасці з'яўляецца міфам. Як варварскія дзяржавы ў рымскіх правінцыях не маглі ўтварыцца незалежна ад рымскіх уплываў, так і тут у непасрэдным кантакце з вышэй развітымі ў грамадскіх адносінах славянамі не магла ўзнікнуць самастойная балцкая дзяржава.

Такім чынам прапануюцца наступныя высновы-тэзы:

1. Дзяржаваўтваральныя працэсы на Панямонні праходзілі ў цеснай сувязі з міжэтнічнымі працэсамі.

2. Міжэтнічныя працэсы не спыніліся пасля ўтварэння Вялікага

[25] Ф. Д. Гуревич, *Древний Новогрудок*, Ленинград 1981.

княства Літоўскага, усходнія славяне працягвалі асімілёўваць мясцовых балтаў, што падважае тэзу аб „літоўскай заваёве” беларускіх зямель.

3. Тэза аб існаванні раннефеадальнай літоўскай дзяржавы выглядае па меншай меры сумніўнай.

4. Знешнепалітычнымі ўмовамі для пачатку дзяржаваўтварэння былі мангола-татарскае нашэсце і крыжацкая агрэсія.

5. Унутраным штуршком да пачатку працэсу мог стаць саюз панямонскіх усходнеславянскіх гарадоў з ваяўнічымі правадырамі балцкіх плямён.

6. Узорам для новай дзяржавы служыла суседняя ўсходнеславянская дзяржаўнасць.

7. Вялікае княства Літоўскае з самых пачаткаў было біэтнічным дзяржаўным утварэннем з дамінаваннем усходнеславянскага элемента.




Карта 1. Балты і славяне на Панямонні ў 2-й пал. I тыс.




Карта 2. Балты і славяне на Панямонні ў 11–14 стст.

Умоўныя пазначэнні да картаў 1,2

| | | |
|---|---|---|
| ⌓ | балцкія | курганныя магільнікі |
| ▲ | усходнеславянскія | |
| ○ | балцкія | селішчы |
| ● | усходнеславянскія | |
| □ | балцкія | гарадзішчы |
| ■ | усходнеславянскія | |
| △ | балцкія | замкі |
| ▲ | усходнеславянскія | |
| ⌴ | балцкі грунтавы магільнік | |
| ♦ | усходнеславянскія гарады | |
| ⊏⊐ | каменныя магілы | |




Карта 3. Этнічныя межы паміж балтамі і славянамі.

Умоўныя пазначэнні да карты 3

— · · — · · — літоўска-крывіцкая мяжа на 7-8 стс. /паводле Е.Ахманьскага/

— — — — археалагічная мяжа паміж балтамі і славянамі на 9 - 10 стст. / паводле У.Галубовіча/

— · — · — гістарычная мяжа паміж Літвой і Руссю у 13 - 14 стст. /паводле Г.Лаўмянскага/

(суцэльная лінія) распаўсюджанне беларускай мовы на 1903 г. /паводле Я.Карскага/

(штрыхоўка) кантактная зона

**Дадатак**

**Спіс археалагічных помнікаў да картаў н-р 1, 2** (не браліся пад увагу помнікі банцараўскай культуры, этнічная інтэрпрэтацыя якіх дыскутуецца між спецыялістамі).

1 — Андрэеўцы (Смаргонскі р-н, Сыраваткаўскі с-т), усходнелітоўскія курганы 5—6 стст. (Г. В. Штыхов, *Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и феодализма*, Минск 1971, вып. 1, с. 155).

2 — Лоша (Астравецкі р-н, Гудагайскі с-т), усходнел. кург. к. 1 тыс. н.э. (*Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл.*, Мінск 1986, с. 91).

3 — Чорная Лужа (Мядзельскі раён), усходнел. кург. 1-я пал. 1 тыс. (Штыхов, с. 197); 10—12 стст. (Я. Г. Зверуго, *Верхнее Понеманье в IX—XIII вв.*, Мінск 1989, с. 24).

4 — Засвір (Мядзельскі р-н, Свірскі п/с), усходнел. кург. 6—12 стст. (*Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобл.*, Мінск 1987, кн. 2, с. 75).

5 — Лынтупы (Пастаўскі р-н, цэнтр п/с), усходнел. кург. 10-13 стст. (*Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобл.*, Мінск 1985, с. 328).

6 — Касоўшчына (Лідскі р-н, Бердаўскі с-т), усходнел. кург. 10-11 стст. (*Збор... Гродн. в.*, с. 242).

7 — Гускі (Мядзельскі р-н, Сырмежскі с-т), усходнел. кург. 5-8 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 73).

8 — Пільвіны (Астравецкі р-н, Падольскі с-т), усходнел. кург. 2-я пал. 1 тыс. (*Збор... Мінск. в.*, с. 93).

9 — Рымшанцы (Смаргонскі р-н), усходнел. кург. 2-я пал. 1 тыс. (Ф. Д. Гуревич, *Древности Белорусского Понеманья*, Москва—Ленинград 1962, с. 175, 219).

10 — Паніззе (Смаргонскі р-н, Сінькоўскі с-т), усходнел. кург. 2-я пал. 1 тыс. (Зверуго, с. 23).

11 — Вайшкуны (Пастаўскі р-н, Лынтупскі п/с), усходнел. кург. 9—11 стст. (*Збор... Віцебск. в.*, с. 322).

12 — Смаргонь, усходнел. кург. пач. 2 тыс. (Зверуго, с. 24).

13 — Жэлядзь (Астравецкі р-н), усходнел. кург. 5—8 стст. (Гуревич, с. 217).

14 — Гуркавіцы (Смаргонскі р-н), усходнел. кург. к. 1 — п. 2 тыс. (Зверуго, с. 26-27).

15 — Сідарышкі (Астравецкі р-н, Падольскі с-т), усходнел. кург. к. 1 — п. 2 тыс. (*Збор... Гродз. в.*, с. 93).

16 — Будраны (Астравецкі р-н, Спондаўскі с-т), усходнел. кург. к. 1 тыс. (*Збор... Гродз. в.*, с. 86).

17 — Гуры (Астравецкі р-н, Ізабелінскі с-т), балцкае селішча 6-7 стст. (Зверуго, с. 48).

18 — Курчына (Мядзельскі р-н, Будслаўскі с-т), балцкае селішча 5—6 стст. (Зверуго, с. 48).

19 — Равячка (Мядзельскі р-н, Будслаўскі с-т), 2 балцкія селішчы 5—6 і 6—7 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 86).

20 — Сосенка (Вілейскі р-н, Касцяневіцкі с-т), балцкае селішча 5—9 стст. (Зверуго, с. 50); славяна-балцкі курганны магільнік 9—10 стст. (Зверуго, с. 46-47).

21 — Гарадзішча (Мядзельскі р-н, Княгінінскі с-т), балцкае гарадзішча і селішча 6—8 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 72-73; Зверуго, с. 48).

22 — Мікольцы (Мядзельскі р-н, Мядзельскі п/с), балцкае гарадзішча і селішча 6—9 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 81; Зверуго, с. 54).

23 — Некасецк (Мядзельскі р-н, Дзягільскі с-т), балцкае гарадзішча і селішча 6—9 стст. і славянскае гарадзішча і селішча 10—11 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 84).

24 — Засвір (Мядзельскі р-н, Свірскі п/с), балцкае селішча 2-я пал. 1 тыс. — пач. 2 тыс., балцкі курганны магільнік 6—12 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 75).

25 — Хведзевічы (Мядзельскі р-н), балцкае селішча 2 пал. 1 тыс. — пач. 2 тыс. (Зверуго, с. 54-56).

26 — Свір (Мядзельскі р-н, гарадскі пасёлак), паводле легенды — замак князя Даўмонта 13 ст. (Зверуго, с. 57-59).

27 — Гальшаны (Ашмянскі р-н, цэнтр с-та), балцкае гарадзішча і селішча 12—14 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 101; Зверуго, с. 59-61).

28 — Занарач (Мядзельскі р-н, цэнтр с-та), славянскі курганны магільнік 9—10 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 74; Зверуго, с. 47).

29 — Гарадзілава (Маладзечанскі р-н, цэнтр с-та), славянскі курганны магільнік 9—10 стст. (Гуревіч, с. 160).

30 — Гарадок (Маладзечанскі р-н, цэнтр с-та), феадальная сядзіба славян 12—14 стст. (Зверуго, с. 92-93).

31 — Высокае (Валожынскі р-н, Гародзькаўскі с-т), дрыгавіцкі курганны могільнік (*Збор... Мінск. в.*, с. 114-115).

32 — Маркіняты (Ашмянскі р-н, Семярніцкі с-т), усходнел. кург. 10—12 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 107).

33 — Пузелі (Воранаўскі р-н, Нацкі с-т), каменныя магілы 10—14 стст. (А. В. Квятковская, *Каменные могильники Белорусского Понеманья*, [в:] *Краткие сообщения Института археологии АН СССР*, Минск 1986, вып. 183, с. 32-41, с. 38; *Збор... Гродз. в.*, с. 146).

34 — Нача (Воранаўскі р-н, цэнтр с-та), балцкі грунтовы магільнік 6—8 стст. і пазней (Гуревич, с. 218).

35 — Салапяцішкі (Воранаўскі р-н, Нацкі с-т), каменныя магілы

12 ст. і пазней (Гуревич, с. 219).

36 — Гарадзішча (Воранаўскі р-н, Радунскі п/с), славянскаае гарадзішча 15—16 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 142).

37 — Чэрнікаўшчына (Дзяржынскі р-н, Фаніпальскі с-т), курганны магільнік дрыгавічоў 9—11 стст. (*Збор...,Мінск. в.*, с. 178).

38 — Ольжава (Лідскі р-н, Тарноўскі с-т), славянскае гарадзішча і селішча 2-я пал. 1 тыс. (Зверуго, с. 94).

39 — Дакудава (Лідскі р-н, цэнтр с-та), славянскае селішча 11-12 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 241).

40 — Мыта (Лідскі р-н, Ваверскі с-т), славянскае гарадзішча і селішча к. 1 тыс. (*Збор... Гродз. в.*, с. 243).

41 — Альхоўка (Навагрудскі р-н, Ацмінаўскі с-т), славянскае селішча 11—13 стст. (Гуревич, с. 219; Зверуго, с. 96).

42 — Дварчаны (Воранаўскі р-н, Забалоцкі с-т), каменныя магілы 12—14 стст. (Зверуго, с. 143).

43 — Дварчаны (Шчучынскі р-н, Орлеўскі с-т), каменныя магілы і селішча 12—13 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 344; Зверуго, с. 41).

44 — Вензаўшчына (Шчучынскі р-н, Першамайскі с-т), каменныя магілы 13—14 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 340-341).

45 — Апонаўцы (Воранаўскі р-н, Забалацкі с-т), каменныя магілы к. 14—15 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 140).

46 — Ясудава (Гродзенскі р-н), курганны магільнік са змешанай заходнеславянска-балцкай культурай, магчыма, належаў яцвягам — 10—11 стст. (Штыхов, с. 136).

47 — Кульбачына (Шчучынскі р-н, Астрынскі с-т), славянскае гарадзішча, магчыма, горад Астрэя, 12—13 стст. (Зверуго, с. 75-76).

48 — Касцянева (Шчучынскі р-н, Галавічпольскі с-т), славянскае гарадзішча, магчыма, горад Вевярэск 12—13 стст. (Зверуго, с. 75-76).

49 — Галынка (Шчучынскі р-н, Орлеўскі с-т), славянскае гарадзішча 14—16 стст., магчыма, замак (*Збор... Гродз. в.*, с. 343).

50 — Каўпакі (Гродзенскі р-н, Капцёўскі с-т), балцкія каменныя курганы 11—13 стст. (Зверуго, с. 35; *Збор... Гродз. в.*, с. 156-157).

51 — Маруліны (Наваградскі р-н, Руткаўскі с-т), славянскі курганны магільнік 11—12 стст. (Штыхов, с. 146; Зверуго, с. 99).

52 — Батароўка (Навагрудак), курганны магільнік, пакінуты змешаным славяна-балцкім насельніцтвам — 12—13 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 264).

53 — Сялец (Навагрудскі р-н, Гарадзечанскі с-т), курганны магільнік дрыгавічоў 10—11 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 278).

54 — Гарадзілаўка (Навагрудскі р-н), славянскі курганны магільнік 10—12 стст. (Гуревич, с. 216).

55 — Мольнічы (Навагрудскі р-н, Гарадзечанскі с-т), курганны

магільнік дрыгавічоў 11 ст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 275).

56 — Суляцічы (Навагрудскі р-н, Гарадзечанскі с-т), курганны магільнік дрыгавічоў 11—13 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 277).

57 — Брацянка (Навагрудскі р-н, Гарадзечанскі с-т), два курганныя магільнікі дрыгавічоў 10—11 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 268).

58 — Ладзенікі (Навагрудскі р-н, Мітрапольскі с-т), славянскі курганны магільнік 10—11 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 271).

59 — Радашковічы (Маладзечанскі р-н), балцкае гарадзішча 5-8 стст. і славянскае гарадзішча 12—13 стст. на месцы балцкага (*Збор... Мінск. в.*, с. 32).

60 — Пурневічы (Баранавіцкі р-н, Пачапаўскі с-т), славянскае гарадзішча і селішча 2-я пал. 1 тыс. і пазней (Гуревич, с. 219; Зверуго, с. 96).

61 — Сёгда (Карэліцкі р-н, Райцаўскі с-т), балта-славянскае гарадзішча 2-пал. 1 тыс. і 12—13 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 222).

62 — Радагошча (Наваградскі р-н, Валеўскі с-т), гарадзішча ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі (*Збор... Гродз. в.*, с. 276; Зверуго, с. 95).

63 — Платава (Наваградскі р-н), славянскі курганны магільнік 11—12 стст. (Гуревич, с. 218; Зверуго, с. 103).

64 — Высацк (Слонімскі р-н, Дзераўнянскі с-т), славянскае гарадзішча і селішча 2-я пал. 1 тыс., і пазней (Гуревич, с. 216; Зверуго, с. 95).

65 — Турэйск (Шчучынскі р-н, Орлеўскі с-т), славянскі горад Турыйск 12—13 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 352).

66 — Саннікі (Дзятлаўскі р-н, Раготнаўскі с-т), славянскае гарадзішча 11 ст. (Штыхов, с. 138; Зверуго, с. 94-95).

67 — Агароднікі (Дзятлаўскі р-н, Мяляхавіцкі с-т), славянскае гарадзішча і селішча 2-я пал. 1 тыс., 10—13 стст. (Гуревич, с. 219; П. Ф. Лысенко, *Дреговичи*, Минск 1991, с. 185).

68 — Дзям'янаўцы (Дзятлаўскі р-н, цэнтр с-та), славянскае селішча 6—8 і 15—16 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 175; Зверуго, с. 96).

69 — Дзям'янаўцы (Дзятлаўскі р-н, цэнтр с-та), курганны магільнік дрыгавічоў 11—13 стст. (Лысенко, с. 183).

70 — Асабнякі (Слонімскі р-н, Азгінавіцкі с-т), славянскае селішча апошняй чвэрці 1 тыс. (Зверуго, с. 96).

71 — Жыровіцы (Слонімскі р-н, цэнтр с-та), слав. гарадзішча (Зверуго, с. 96).

72 — Арловічы (Слонімскі р-н), славянскі курганны магільнік 11—12 стст. (Гуревич, с. 219; Лысенко, с. 188).

73 — Збочна (Слонімскі р-н, Азярніцкі с-т), феадальны замак усходніх славян 12—13 стст. (Зверуго, с. 91-92).

74 — Шылавічы (Слонімскі р-н, цэнтр с-та), славянскае селішча апошняй чвэрці 1 тыс. (Зверуго, с. 96).

75 — Талькаўшчына (Слонімскі р-н, Паўлаўскі с-т), славянскае селішча апошняй чвэрці 1 тыс. (Зверуго, с. 96).

76 — Дзераўная (Слонімскі р-н, цэнтр с-та), славянскае гарадзішча 2-я пал. 1 тыс. і пазней (*Гуревич*, с. 217; Зверуго, с. 94).

77 — Кавалі (Слонімскі р-н, Дзераўноўскі с-т), славянскае селішча 2-я пал. 1 тыс., 11—14 стст. (Зверуго, с. 96; Гуревич, с. 217).

78 — Ніз (Слонімскі р-н, Кастровіцкі с-т), селішча апошняй чвэрці 1 тыс., 11—13 стст. (Зверуго, с. 96; Гуревич, с. 218).

79 — Ягначы (Зэльвенскі р-н), славянскае гарадзішча (Зверуго, с. 95).

80 — Навасёлкі (Зэльвенскі р-н, Каралінскі с-т), каменныя магілы позняга сярэднявечча (*Збор... Гродз. в.*, с. 190).

81 — Пескі (Мастоўскі р-н, цэнтр с-та), славянскае селішча 11-13 стст. (Зверуго, с. 98; Гуревич, с. 219).

82 — Краснасельскі (Ваўкавыскі р-н, цэнтр п/с), славянскае селішча 10—11 стст. (Гуревич, с. 218; Зверуго, с. 98).

83 — Падрось (Ваўкавыскі р-н, Краснасельскі п/с), курганны магільнік мяшанага дрыгавіцка-мазавецкага насельніцтва, ці дрыгавічоў пад уплывам заходніх суседзяў — 11—12 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 134).

84 — Мітрані (Ваўкавыскі р-н, Ваўкавыскі с-т), каменныя курганы мяжы 1 і 2 тыс. (Зверуго, с. 31-32).

85 — Рыбакі (Мастоўскі р-н, Зарудаўеўскі с-т), славянскае гарадзішча 14—16 стст. і больш ранняга часу (Зверуго, с. 94).

86 — Мсцібава (Ваўкавыскі р-н, Гнезнаўскі с-т), феадальны славянскі замак 11—13 стст. (Зверуго, с. 89-91).

87 — Індура (Гродзенскі р-н, цэнтр с-та), феадальны славянскі замак 11—13 стст. (Зверуго, с. 89-91).

88 — Гарадзішча (Баранавіцкі р-н, г.п.), балцкае гарадзішча (?), 2-я пал. 1 тыс. і 11—13 стст. (Гуревич, с. 216; *Збор... Брэсц. в.*, с. 80).

89 — Лазы (Ваўкавыскі р-н, Роскі с-т), славянскі курган 9—12 стст. (Лысенко, с. 183).

90 — Высокае (Ашмянскі р-н, Крайванцаўскі с-т), славянскі курганны могільнік 11— 2 стст. (Лысенко, с. 188; Гуревич, с. 216).

91 — Казароўшчына (Смаргонскі р-н, Сінькоўскі с-т), славянскі курганны могільнік 11—12 стст. (Лысенко, с. 188; Гуревич, с. 217).

92 — Лоск (Валожынскі р-н, Гародзькаўскі с-т), славянскае гарадзішча 13—16 стст. (Лысенко, с. 198).

93 — Сапоцкін (Гродзенскі р-н, г.п.), балцкі курганны магільнік 10—11 стст. (*Збор... Гродз. в.*, с. 161).

94 — Лужаны (Валожынскі р-н, Сугваздаўскі с-т), каменныя магілы (*Збор... Мінск. в.*, с. 125).

95 — Камень (Валожынскі р-н, Івянецкі с-т), селішча славян эпохі Кіеўскай Русі (*Збор... Мінская в.*, с. 123).

96 — Гілікі (Валожынскі р-н, Івянецкі с-т), каменныя магілы (*Збор... Мінск. в.*, с. 115).

97 — Клепачы (Слонімскі р-н, Азярніцкі с-т), каменныя магілы 14 ст., 15—16 стст. (Гуревич, с. 217; *Збор... Гродз. в.*, с. 312).

98 — Мінеўшчына (Ваўкавыскі р-н, Краснасельскі с-т), каменныя магілы позняга сярэднявечча (*Збор... Гродз. в.*, с. 133).

99 — Збляны (Лідскі р-н, Беліцкі с-т), каменны магільнік (Квятковская, рис.1).

100 — Зарой (Дзятлаўскі р-н, Лезнявіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

101 — Карыца II (Дзятлаўскі р-н, Лезнявіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

102 — Кузьмічы (Дзятлаўскі р-н, Лезнявіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

103 — Каменка (Наваградскі р-н, Кашалёўскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

104 — Лапухова (Слонімскі р-н, Міжэвіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

105 — Малая Кракотка (Слонімскі р-н, Сялявіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

106 — Збочна (Слонімскі р-н, Азярніцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

107 — Альшаны (Карэліцкі р-н, Цырынскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

108 — Куправічы (Іўеўскі р-н, Лаздунскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

109 — Косава (Івацэвіцкі р-н, горад), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

110 — Латыгаль (Вілейскі р-н, Вязынскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

111 — Ілья (Вілейскі р-н, цэнтр с-та), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

112 — Маркіняты (Ашмянскі р-н, Семярніцкі с-т), каменныя магілы к. 11 ст. (Квятковская, рис. 1).

113 — Галынка (Зэльвенскі р-н, цэнтр с-та), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

114 — Клімавічы (Зэльвенскі р-н, Галынкаўскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

115 — Старае Сяло (Зэльвенскі р-н, Галынкаўскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

116 — Пустаборы (Зэльвенскі р-н, Галынкаўскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

117 — Снежная (Зэльвенскі р-н, Галынкаўскі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

118 — Куцэйкі (Слонімскі р-н, Кастровіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

119 — Шулякі (Зэльвенскі р-н, Сынковіцкі с-т), каменныя магілы (Квятковская, рис. 1).

120 — Верхаўляны (Бераставіцкі р-н, Алекшыцкі с-т), славянскае гарадзішча 9—13 стст. (Лысенко, с. 183).

121 — Мядзел (цэнтр раёна), курганны магільнік 10—11 стст., пакінуты змешаным славяна-балцкім насельніцтвам (*Збор... Мінск. в.*, с. 67).

122 — Забар'е (Вілейскі р-н, Хаценчыцкі с-т), славянскі курганны магільнік 10—13 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 144; Зверуго, с. 106).

123 — Камена (Вілейскі р-н, Даўгінаўскі с-т), славянскі курганны магільнік 10—11 і 13—14 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 147).

124 — Любоўшы (Вілейскі р-н, Любанскі с-т), славянскі курганны магільнік 10—13 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 151; Зверуго, с. 106).

125 — Насілава (Маладзечанскі р-н, Цюрлеўскі с-т), балцкае гарадзішча 1—8 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 28).

126 — Пекары (Маладзечанскі р-н, Хохлаўскі с-т), славянскі курганны магільнік 10—13 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 29; Зверуго, с. 106).

127 — Нагаўкі (Мядзельскі р-н, Дзягільскі с-т), славянскі курганны магільнік 10—13 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 82; Зверуго, с. 106).

128 — Наўры (Мядзельскі р-н, Сваткаўскі с-т), курганны магільнік 11—12 стст., належаў крывічам і дрыгавічам (*Збор... Мінск. в.*, с. 84).

129 — Кастыкі (Вілейскі р-н, Касцяневіцкі с-т), курганны магільнік 11—12 стст., належаў мяшанаму крывіцка-дрыгавіцкаму насельніцтву (*Збор... Мінск. в.*, с. 147).

130 — Скары (Мядзельскі р-н, Нарачанскі с-т), славянскае селішча эпохі Кіеўскай Русі (*Збор... Мінск. в.*, с. 89).

131 — Галінова (Вілейскі р-н, Куранецкі с-т), балцкі (?) курганны магільнік 7—10 стст. (*Збор... Мінск. в.*, с. 142).

132 — Малявічы (Вілейскі р-н, Хаценчыцкі с-т), каменныя магілы (*Збор... Мінск. в.*, с. 154).

133 — Ручыца (Вілейскі р-н, Нарачанскі с-т), каменныя магілы (*Збор... Мінск. в.*, с. 157).

134 — Хаценчыцы (Вілейскі р-н, цэнтр с-та), каменныя магілы (*Збор... Мінск. в.*, с. 160).

135 — Гуркі (Вілейскі р-н), доўгія курганы 2-я пал. 1 тыс. (Зверуго, с. 108-109).